УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ
ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

Філалагічны факультэт
Кафедра беларускай літаратуры і культуры

# ТВОРЧАСЦЬ АНАТОЛЯ СЫСА: ІДЭЙНА-ЗМЕСТАВЫ І ЖАНРАВА-СТЫЛЯВЫ АСПЕКТЫ ВЫВУЧЭННЯ

Дыпломная работа
студэнткі 52 групы
5 курса спецыяльнасці
«Беларуская мова і літаратура.
Журналістыка»
дзённай формы
атрымання адукацыі
__________Курман
Ганны Аляксандраўны

Дапушчана да абароны

Загадчык кафедры ________ І.М. Гоўзіч

Пратакол № 10 ад 03.05.2016 г.

Абаронена 23 чэрвеня 2016 г.
з адзнакай «10 (дзесяць)»

Навуковы кіраўнік –
кандыдат філалагічных
навук, дацэнт
__________Н.В. Заяц

Мінск, 2016

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Scanned by CamScanner

## РЭФЕРАТ

Курман Ганна Аляксандраўна

**Творчасць Анатоля Сыса: ідэйна-зместавы і жанрава-стылявы аспекты вывучэння**

**Ключавыя словы:** паэзія, лірыка, ідэя, жанр, стыль, вобраз.

**Аб'ект даследавання** – зборнікі "Агмень" (1988), "Пан лес" (1989), "Сыс" (2002), а таксама кніга выбранага "Лён" (2006), якая з'яўляецца найбольш поўным выданнем літаратурнай спадчыны А. Сыса і ўключае ў сябе невядомыя творы паэта, фотаздымкі, артыкулы і інтэрв'ю.

**Прадмет даследавання** – ідэйна-зместавая і жанрава-стылявая адметнасць паэтычнага набытку А. Сыса.

**Мэта работы** – даследаваць ідэйна-зместавую і жанрава-стылявую спецыфіку творчасці А. Сыса.

**Метадалагічную базу** дыпломнай работы складаюць напрацоўкі ў галіне гісторыі і тэорыі літаратуры, крытычныя і літаратуразнаўчыя артыкулы. Выкарыстоўваюцца метад крытычнага аналізу навуковай літаратуры, асноўныя прыёмы кагнітыўнага і герменеўтычнага метадаў.

**Навуковая навізна.** Актуальнасць і навізна выбранай тэмы тлумачацца адсутнасцю спецыяльнай комплекснай работы ў святле заяўленага ў назве дыпломнага даследавання пытання. У рабоце выяўлены ідэйна-сэнсавыя дамінанты паэзіі А. Сыса, вызначана іх мастацкая функцыя, прааналізаваны асноўныя тэмы, матывы, вобразы лірыкі паэта, вызначана жанрава-стялявая адметнасць твораў А.Сыса, даследавана эвалюцыя мастацкага светабачання і светаўспрымання аўтара.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Вынікі дыпломнай работы могуць стаць падмуркам для новых даследаванняў у галіне літаратуразнаўства, а таксама для далейшага вывучэння творчасці А. Сыса. Асобныя палажэнні і вынікі дыпломнай работы могуць быць выкарыстаны для распрацоўкі ўрокаў літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, правядзення практычных і семінарскіх заняткаў у ВНУ, пры падрыхтоўцы дыпломных і курсавых работ студэнтамі-філолагамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Scanned by CamScanner